**Г. Кершыс**

# БЕЛАРУСКІЯ СЛЯДЫ Ў ЖЫЦЦІ М. К. ЧУРЛЁНІСА: ЗАГАДКА ПАМЯТНАГА ЗНАКА Ў МІНСКУ

У мінулым годзе адзначалася 145 гадоў з дня нараджэння літоўскага генія М. К. Чурлёніса, які сваёй творчасцю далёка рассунуў межы як нацыянальнай, так і сусветнай культуры. Хаця сусветна вядомы музыка і мастак ніколі не жыў у Мінску, аднак у яго жыццё ўплецена шмат беларускіх нітак.

М. Чурлёніс рос у маленькім мястэчку Друскінінкай, дзе знаходзіўся вядомы ва ўсіх краях аднайменны санаторый. Яго галоўным урачом і сябрам сям'і быў беларус Ю. Маркевіч. Так, паводле рэкамендацыйнага ліста апошняга, юны літоўскі хлопчык Мікалоюс трапіў да князя Міхаіла М. С. М. Агінскага ў Плунзе. Князь быў вельмі задаволены стараннасцю, таму ўзяў на сябе аплату за яго далейшае навучанне.

У Варшаўскім музычным інстытуце Чурлёніс пачаў вучыцца на кампазітара. І зусім хутка з'явілася на свет сімфанічная паэма «У лесе», якая заклала падмурак літоўскай прафесійнай музыкі і застаецца па гэты дзень яе найвышэйшым дасягненнем. Ва ўзросце 27 гадоў, будучы сур'ёзным музыкам, ён вырашыў стаць мастаком. Пра яго пісалі як пра мастака, які не пераставаў «марыць гукамі». Мікалоюс пазнаёміўся з С. Кімантайтэ – студэнткай філалагічнага факультэта Кракаўскага ўніверсітэта. Яна была літоўкай напалову, толькі па бацьку. Яе маці паходзіла з беларускага

шляхецкага роду Чарнoцкіх. Яны ажаніліся і ненадоўга пераехалі у Санкт-Пецярбург. Самымі знакамітымі карцінамі таго перыяду сталі «Казка каралёў» і «Рай».

Чурлёніс у працы не шкадаваў сябе фізічна і эмацыйна, таму цяжка захварэў. Сафіі прыйшлося забраць яго на радзіму. Потым стан пагоршыўся: нервовае пераўтамленне. Ён трапіў ў бальніцу пад Варшавай. У гэты ж час Сафія, або, як яе называў Мікалоюс – Зося, зацяжарыла і жыла ў Мінску ў маёнтку сваякоў Чарнoцкіх (цяпер ст. м. Пятроўшчына). Там жа, 12 чэрвеня 1910 г. нарадзілася дачка Д. Чурленітэ (літ. *Danutė Čiurlionytė*), якую мастак так і не пабачыў. М. К. Чурлёніс памёр 10 красавіка 1911 г. Пасля яго засталася велізарная колькасць работ у жывапісу, музыцы і літаратуры.

30 верасня 2015 г. агенцтва «Мінск-Навіны» апублікавала артыкул пра адкрыццё памятнага знака. «Ужо некалькі тыдняў мы святкуем важную дату – 140 гадоў з дня нараджэння М. Чурлёніса, – казаў Э. Ігнатавічус, Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Літоўскай Рэспублікі ў Рэспубліцы Беларусь (2013–2016), – ён перасягнуў сваёй творчасцю рубяжы Літвы і вядомы за яе межамі. Сёння мы адкрываем гісторыю Чурлёніса і ў Мінску. Мы будзем наведваць помнік не толькі ў дні нараджэння паэта і мастака. І не толькі літоўскія турысты, але і мінчане. Бо гэта маладое месца, дзе жыве шмат студэнтаў».

На погляд аўтара гэтых радкоў, памятны знак не толькі даніна павагі вялікаму таленту М. К. Чурлёніса, але і сімвал сяброўскіх адносін двух народаў, доказ сувязі, якая праходзіць праз кожнага з нас ніткамі лёсу.